ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
13
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 18 (1356)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА ЧАРГОВЫМ

пасяджэнні камітэта народнага кантролю універсітэта абмеркаваны вынікі праверак наведвання паточных лекцый і работы кафедр на ФПМ і факультэце радыёфізікі і электронікі; кантролю і ўліку работы сумяшчальнікаў і пачасавікоў на механіка-матэматычным, юрыдычным і геаграфічным факультэтах, на кафедры фізвыхавання і спорту; работы сталовых і буфетаў, якія абслугоўваюць студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Заслуханы справаздачы груп народнага кантролю мехмата і праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў.

**А. ЛЫСЮК.**

### КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

па кнізе Л. І. Брэжнева «Успаміны» праведзена на факультэце прыкладной матэматыкі. У яе рабоце прыняў удзел інжынер-палкоўнік у адстаўцы, ветэран 18-й арміі І. П. Шэйнгауз, які неаднаразова сустракаўся з Леанідам Ільічом на легендарнай Малой зямлі.

**А. КІШКЕВІЧ.**

### ВЯДОМЫ БЕЛАРУСКІ

дзіцячы пісьменнік Васіль Вітка сустрэўся са студэнтамі філалагічнага факультэта. Аб яго жыцці і творчасці расказала ў час сустрэчы выкладчыца факультэта Т. В. Кабржыцкая. Пісьменнік адказаў на пытанні прысутных, акрэсліў шляхі развіцця сучаснай дзіцячай літаратуры.

**С. МАХОНЬ,**
**студэнт філфака.**

### ГОСЦЕМ ФАКУЛЬТЭТА

журналістыкі быў член праўлення Саюза журналістаў СССР, дэкан факультэта журналістыкі МДУ імя М. В. Ламаносава Я. М. Засурскі. Ён падрабязна расказаў аб падрыхтоўцы высокакваліфікаваных журналістаў у Маскоўскім універсітэце.

**А. ІВАНОЎ,**
**студэнт журфака.**

### КОНКУРС ПАЛІТЫЧНАЙ

песні, прысвечаны 60-годдзю ўтварэння СССР, які будзе праходзіць ва універсітэце 17 мая, праводзіцца ў плане падрыхтоўкі да II Рэспубліканскага фестывалю палітычнай песні моладзі і студэнтаў. Да ўдзелу ў ім запрашаюцца салісты, вакальныя групы і вакальныя ансамблі ўсіх падраздзяленняў БДУ.

**Л. БАРАНОЎСКАЯ,**
**інструктар студэнцкага клуба.**

## СЁННЯ — ЯКАСЦЬ ВЕДАЎ, ЗАЎТРА — ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦЫ!









**НАБЛІЖАЕЦЦА СЕСІЯ. І першы подых яе, першая прыкмета—залік. Хвалююцца чацвёртакурснікі журфака, хоць гэта не першы ў іх жыцці залік. Уважліва слухае студэнтаў дацэнт кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў Мікалай Сцяпанавіч Гурчанка. Першы залік — «Навуковыя асновы кіравання і планавання» — вытрымалі ўсе!**

Фота **В. Шачака.**

● **ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА**

## «НА ВЁСКУ, ДЗЯДУЛІ...»

**РЭДАКЦЫЯ АТРЫМАЛА АДКАЗ НА МАТЭРЫЯЛ З ТАКОЙ НАЗВАЙ, ЗМЕШЧАНЫ Ў ГАЗЕЦЕ 1 КРАСАВІКА 1982 ГОДА:**

По заметцы, змешчанай у газеце «Беларускі універсітэт» 1.04.82 г. пад назвай «На вёску, дзядулі...» аб засарціроўках пісьмовай карэспандэнцыі, праведзена праверка.

Праверкай устаноўлена, што гэтыя факты сапраўды мелі месца ў асобных выпадках у сувязі з няправільным указаннем адрасу назначэння адправіцелямі пісьмаў (пасля назвы вуліцы замест нумара дома ўказваўся нумар інтэрната). Але ў асноўным засарціроўкі пісьмаў дапускаліся па віне сарціроўшчыцы І. В. Кульчыцкай.

Для непаўтарэння падобных фактаў у далейшым заметка «На вёску, дзядулі...» абмеркавана ў калектыве ўчастка.

За дапушчаны брак у рабоце сарціроўшчыца т. Кульчыцкая па выніках работы за красавік гэтага года будзе пазбаўлена прэміяльнай аплаты.

Начальніку ўчастка гарадской пошты ўказана на ўзмацненне кантролю за работай падначаленых.

**Т. ЛЕАНОВІЧ,**
**намеснік начальніка Мінскага паштамта.**

● **РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ**

## Вядзе за сабой

ВЕСЕЛА і цікава жывуць студэнты трэцяй групы другакурснікаў хімічнага факультэта. Дзяўчаты пасябравалі з першых дзён вучобы ва універсітэце. Знаёмства выпала на час уборкі бульбы ў калгасе. І хоць ужо мінула больш як паўтара года сумеснай вучобы, але ўсе згаджаюцца, што іменна тады згуртаваўся калектыў.

Сёлета дзяўчаты збіраюцца паехаць у сельскагаспадарчы атрад «Чырвоныя гваздзікі», камісарам якога выбралі Галіну Снапко.

З Галяй я сустракалася неаднойчы. У вучэбнай аўдыторыі, у камітэце камсамола, у лабараторыі — усюды яна ў акружэнні аднакурснікаў. Выдатніца вучобы, член студэнцкага навуковага таварыства, Галіна займаецца ў гуртку пры кафедры неарганічнай хіміі. Цяпер завяршае навуковую работу «Атрыманне светаадчувальных папер на аснове ёдзістага свінцу».

— Спачатку нічога не атрымлівалася, — расказвае Галя,— але я вырашыла быць настойлівай да канца, і мой кіраўнік хацела, каб я сама прыйшла да фінішу. Прыемна, што маё даследаванне ўдалося.

Зацікаўленасць Галіны Снапко да хіміі пачалася ў школе. Школьная мара стаць хімікам і прывяла яе на вытворчы паток хімічнага факультэта.

Таварышы паважаюць Галіну. Яна ні ў чым не адмовіць, дапаможа ў падрыхтоўцы да практычных і семінарскіх заняткаў.

За клапатлівасць і выбралі яе праформгам групы. Галя старанна выконвае свае абавязкі.

З Галінай цікава правесці вольны час. Перавагу яна аддае турыстычнаму спорту. Зацікавіла ім і сваіх сяброўак.

У гэтым дружным дзявочым калектыве ўсё ўзаемазвязана. Тыдзень за тыднем бяжыць іх шчаслівы студэнцкі час. Напружаныя дні вучобы змяняе актыўны адпачынак.

І ў любой карыснай справе, у арганізацыі вучобы і адпачынку, цікавага, паўнацэннага, дапаможа Галіна Снапко — адна з лепшых студэнтак хімічнага факультэта.

**Н. ЯНЫШ,**
**студэнтка журфака.**



**НА ЗДЫМКУ: выдатніца вучобы, камісар сельскагаспадарчага атрада «Чырвоныя гваздзікі», студэнтка хімічнага факультэта Галіна Снапко.**

Фота **аўтара.**

● НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ, НІШТО НЕ ЗАБЫТА

# БЫЎ ЛАЎСКІ БОЙ...

— З ЧАГО ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ? — перапытаў трэцякурснік факультэта радыёфізікі і электронікі Уладзімір Гафановіч, прыпыняючыся ля кастра побач з нядаўна аднаўленымі зямлянкамі на месцы партызанскага лагера ў Лаўскім лесе.— Калі універсітэцкая група «Доўг» сабрала спісы ўсіх былых студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, высветлілася, што некалькі ветэранаў з тых, хто змагаўся за вызваленне Радзімы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, уваходзілі ў састаў вядомай 300-й партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава, якая дзейнічала на тэрыторыі Уздзенскага, Капыльскага, Дзяржынскага, Чырвонаслабодскага і Слуцкага раёнаў Мінскай вобласці. Мы сустрэліся з імі, запісалі іх успаміны і вырашылі сабраць больш шырокія звесткі аб баявой дзейнасці брыгады. Адначасова ўзнікла думка дапамагчы былым баявым сябрам сабрацца разам. Мы ўжо ведалі, што многія з іх не бачыліся з часоў вайны...

Усе, хто прыехаў сёлета ва універсітэт на святкаванне Дня Перамогі, цёпла ўспамінаюць мінулагоднюю першую сустрэчу і дзякуюць студэнтам за ініцыятыву, за дапамогу, за памяць. Амаль 80 былых баявых сяброў сабралі тады студэнты на месцы размяшчэння брыгады ў лесе каля вёскі Лавы Уздзенскага раёна. Усё было там — і шчырая радасць сустрэч, і слёзы тугі па загінуўшых, і ўспаміны, успаміны, успаміны...

Зараз амаль немагчыма даведацца, хто першы выказаў думку аб стварэнні тут, у памятным лесе, мемарыяльнага партызанскага лагера. Але ідэя запомнілася і спадабалася. Ёй суджана было здзейсніцца...

І Ванда Роліч з філфака, і фізік Жэня Памыткін, і радыёфізікі Алёша Гуцікаў, Дзіма Букаты, Віталій Рындзевіч, Таня Замкавец з ФПМ, Люда Астаповіч з біяфака — усе яны шмат могуць расказаць аб тым, як няпроста было здабыць неабходныя матэрыялы для будаўніцтва; колькі часу і сіл спатрэбілася, каб падрыхтаваныя да свята стэнды аб кожным з партызанскіх атрадаў, што ўваходзілі ў састаў брыгады, вызначаліся дакладнасцю і гістарычнасцю; аб непрыкметнай, але доўгай і неабходнай рабоце па непасрэднай арганізацыі сустрэчы. Нарэшце, аб самім будаўніцтве зямлянак маглі б паведаміць байцы мехматаўскага камуністычнага атрада «Арсенал», для якога гэта пачэснае даручэнне стала ўдарнай справай і сапраўдным баявым выпрабаваннем перад працоўным летам. Але якімі б яркімі ні былі словы, куды красамоўней за іх — вочы людзей, якія сабраліся на адкрыццё пабудаванага студэнтамі мемарыяла.

— Мы пазнаём гэтыя мясціны,—сказаў на мітынгу ля зямлянак былы начальнік разведкі брыгады імя К. Я. Варашылава Мікалай Рыгоравіч Расляков.— Бясспрэчна, зараз цяжка сказаць — тут вось была выкапана наша зямлянка ці побач, на гэтым месцы гарэў касцёр ці крыху далей. Але ўсё гэта было тут, у Лаўскім лесе. Мы пазнаём мясціны, мы пазнаём лес, не пазнаём толькі ... сябе.




Сівыя скроні, твары з адбіткамі часу. У некаторых у руках кіёк, бо сталі непаслухмянымі ногі. Чырвоныя стужкі на адзенні — прыкмета свята. Ордэны, медалі. Тады гэтым людзям было каму 18, каму 20, каму каля 30 год...

Не нагаворацца былыя сябры. І не дзіўна! 37 гадоў не бачыліся былыя камандзір і камісар аднаго з атрадаў. Камісар убачыў свайго камандзіра сёння раніцой на трыбуне ў час святочнага мітынгу, куды запрошаны былі ўсе ветэраны-варашылаўцы. Сабраў былых байцоў атрада: «Ці не наш гэта камандзір?» Але сумненні не развеяліся. А потым, пасля ўскладання кветак да помніка партызанам варашылаўскай брыгады, якія 29 чэрвеня 1944 года вызвалілі Узду, і воінам Савецкай Арміі, што загінулі на тэрыторыі раёна, Васіль Дзмітрыевіч не стрымаўся, падышоў да зацікавіўшага яго чалавека:

— Карніенка Іван Сяргеевіч, 1921 года нараджэння?

— Так!

— А я хто?

І ўбачыўшы, што стары сябар не пазнае, Васіль Дзмітрыевіч не вытрымаў:

— Ну, а хто ж у цябе камісарам быў?

— Петухоў!

Пацалункі, абдымкі. І не адрозніш, ці то кроплі дажджу на тварах, ці то, разам з імі— слёзы.

— Хіба ж пазнаеш яго цяпер?— каменціруе сустрэчу М. Р. Расляков. — Тады адзін чуб чаго варты быў! А знешні выгляд! Ведаеце, не было такой зброі ў атрадзе, якую не насіў бы Ваня Карніенка. Ну, зразумела, аўтамат, да яго запасныя дыскі, не менш як тры «лімонкі» на поясе, ды яшчэ маўзер збоку...

— Цэ так було,— згаджаецца Іван Сяргеевіч, які ўжо 20 гадоў узначальвае адзін з калгасаў на Украіне. І на мірным пасту застаўся ён верным сваім баявым традыцыям — побач з ордэнамі Чырвонай Зоркі і Баявога Чырвонага Сцяга на грудзях у былога камандзіра зіхацяць два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга.



...Сюды, да зямлянак, дарога ад стаянкі аўтобусаў, нягледзячы на невялікую адлегласць, была доўгай. Разрэзана чырвоная стужка ў пачатку яе — і ўсе прыпыніліся каля стэндаў. На іх фотаздымкі, копіі дакументаў. Не перапыніць стыхійныя ўспаміны, расказы. Зараз усе разам — ветэраны, студэнты, мясцовыя жыхары. Ажываюць успаміны ў адных. Жывая гісторыя паўстае побач з другімі.

Да аднаго са стэндаў з цяжкасцю нахіляецца згорблены чалавек, якога падтрымлівае немаладая ўжо дачка. Яны мясцовыя, з бліжэйшай вёскі.

— Можа, пазнаю каго з тых, з кім ваяваў!—напружвае зрок стары.

— Я зараз у суседнім раёне жыву,— расказвае бабулька ў стракатай хустачцы. — Шмат гадоў сюды не вярталася. Вось сёлета дзеці прывезлі. А калісьці была сувязной...

Акружаны студэнтамі, нешта паказвае на стэндзе сівавалосы чалавек.

— Легендарная асоба брыгады — Уладзімір Міхайлавіч Якаўлеў. Ён кіраваў контрразведкай, — сказаў пра яго Валодзя Гафановіч.

**...Лаўскі лес стаў базавым для брыгады зімой 1942 года па многіх прычынах. Ён гранічыў з некалькімі раёнамі, што дазваляла расшырыць баявыя дзеянні і, што было таксама немалаважным, знаходзіўся далёка ад месц сканцэнтравання немцаў.**

**Да зімоўкі падрыхтаваліся грунтоўна. Пабудавалі зямлянкі, назапасілі правіянт. Тут жа размясціўся партызанскі шпіталь. Але ў снежні, каб нарэшце знішчыць варашылаўцаў, фашысты арганізавалі вялікую карную экспедыцыю. Больш за 7 тысяч гітлераўцаў з танкамі, бронемашынамі, артылерыяй выступілі супраць партызан з мэтай блакіраваць і знішчыць брыгаду па частках. Рыхтуючыся да бою, партызаны выслалі наперад, на падыходы да лесу, невялікія групы добраахвотнікаў. Узводу Вікенція Драздовіча выпала трымаць абарону ля вёскі Клецішчы. Іменна гэтай дарогай рухаўся перадавы атрад варожых салдат. Ішлі яны спакойна, упэўненыя ў сваёй сіле, у сваёй перавазе. Як мага бліжэй падпусцілі іх партызаны...**

**Восем атак на працягу 4 гадзін адбіла невялікая жменька патрыётаў. За гэты час брыгада паспела эвакуіраваць шпіталь, падцягнуць рэзервы і падрыхтавацца да бою, які ішоў увесь дзень — 3 снежня 1942 года. А ўвечары карнікі вымушаны былі адступіць.**

**Восем атак. У апошнюю, рукапашную, калі ўжо скончыліся боепрыпасы, усталі шасцёра з васемнаццаці. Усталі, каб праз імгненне назаўсёды легчы побач з сябрамі, але ў апошнім парыве, па магчымасці, знішчыць яшчэ аднаго ворага...**

**Бронзавы воін схіліў баявы сцяг на ўскрайку могілак за вёскай Клецішчы. На пастаменце — 18 прозвішчаў. Потым ужо нашчадкі даведаюцца, што адзін з патрыётаў — кадравы лётчык, які ваяваў у Іспаніі, збіты ў пачатку вайны над Беларуссю. Другі — аматар музыкі, які марыў аб кансерваторыі і больш за ўсе каштоўнасці захоўваў любімую скрыпку. Трэці — толькі за дзень да пачатку вайны атрымаў атэстат аб сярэдняй адукацыі. Чацвёрты, самы малодшы, —не паспеў нават сфатаграфавацца на пашпарт. Пяты — прыйшоў у атрад, каб адпомсціць за закатаваную маці...**

Усхваляваны ўспамінамі, выцірае набегшыя слёзы былы камісар партызанскага атрада імя Б. Хмяльніцкага, былы прарэктар універсітэта Аляксей Сцяпанавіч Зюба. Тут навечна маладымі засталіся ляжаць яго баявыя сябры.

...А насупраць помніка, на неабсяжным калгасным полі, абмытыя веснавым дажджом, прабіваюцца зялёныя сцяблінкі. На зямлі, што загаіла ваенныя раны, расце хлеб...

Т. САХАШЧЫК,
наш спец. кар.
Фота аўтара.





ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Г. ДЗІМІТРАВА



# Тыдзень савецка-балгарскай дружбы

ШЧЫРЫМ сцвярджэннем сяброўскіх адносін народаў-братоў стаў тыдзень савецка-балгарскай дружбы, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Георгія Дзімітрава, які праходзіць зараз ва універсітэце.

У яго праграме — гутаркі аб слаўным сыне балгарскага народа, якія прайшлі на ўсіх факультэтах, дэманстрацыя мастацкіх фільмаў аб Георгію Дзімітраве «Кавадла ці молат» і «Пажар», IX савецка-балгарская студэнцкая канферэнцыя і, падрыхтаваная сумесна з Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Інстытутам гісторыі АН БССР і Беларускім аддзяленнем Таварыства савецка-балгарскай дружбы навуковая канферэнцыя, прысвечаная юбілею вядомага дзеяча міжнароднага рабочага руху.

На пятым паверсе галоўнага корпуса універсітэта экспануецца выстаўка «Наш сябар — сацыялістычная Балгарыя (гісторыя, эканамічнае і культурнае жыццё, савецка-балгарская дружба)». І яшчэ адна выстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Г. Дзімітрава. А абанемент навуковай і мастацкай літаратуры універсітэцкай бібліятэкі сумесна з універсітэцкім аддзяленнем Таварыства савецка-балгарскай дружбы падрыхтаваў да знамянальнай даты адкрыты агляд літаратуры «Выдатны барацьбіт за справу камунізму».

На студэнцкай навуковай канферэнцыі з дакладамі аб жыцці і дзейнасці Г. Дзімітрава выступілі студэнты з НРБ Мікалай Стаіменаў і Дзіяна Савава, студэнткі гістфака В. Вабішэвіч, Н. Іванова, Ж. Карп, В. Лосік, а таксама прадстаўнікі Мінскага інстытута культуры Ваня Грашкіна, Весела Ганчава, Элі Кірылава. Гасцей і ўдзельнікаў канферэнцыі вітаў дацэнт Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага Цветан Йотаў.

Тыдзень закончыцца ўрачыстым вечарам савецка-балгарскай дружбы.

**Т. АЛЯКСАНДРАВА.**

# Спадчына Дзімітрава

НАДЫХОДЗЯЧЫ 100-гадовы юбілей правадыра і настаўніка балгарскага народа Георгія Дзімітрава выклікае ў нас унутраную неабходнасць яшчэ раз прайсці ў думках па яго жыццёваму шляху. І тады перад намі паўстае воблік тытана думкі і вобраз геніяльнага тэарэтыка, арганізатара і кіраўніка камуністычнага і рабочага руху ў сусветным маштабе. Імя героя Лейпцыга скаланула ўсю планету і стала сімвалам мужнай барацьбы супраць фашызму, сімвалам надзеі для мільёнаў прыгнечаных. І яны паверылі Дзімітраву, калі з трыбуны VII Кангрэса Камуністычнага інтэрнацыянала ён абгрунтаваў неабходнасць новай стратэгіі і тактыкі міжнароднага камуністычнага руху і намеціў новыя перспектывы барацьбы супраць фашызму і вайны. У гераічныя гады антыфашысцкай барацьбы імя і дзейнасць Георгія Дзімітрава сталі для рэвалюцыйнай моладзі натхняючым прыкладам. Балгарскі народ ганарыўся і ганарыцца тым, што свае першыя крокі маладая балгарская рэспубліка зрабіла пад кіраўніцтвам гэтага цудоўнага чалавека і выдатнага рэвалюцыянера.

Але ці правільна гаварыць пра справу і значэнне ідэй Дзімітрава толькі ў мінулым часе? Мы ўпэўнена можам сказаць, што яго ідэі і сёння з'яўляюцца моцнай зброяй супраць антыкамунізму, за мір і сацыяльны прагрэс. Запаветы Георгія Дзімітрава балгарская моладзь свята захоўвае, кіруецца імі ў будаўніцтве камунізму ў нашай краіне. Іменна таму ў нас такія поспехі, іменна таму сацыялістычная Балгарыя дасягнула сённяшняй вышыні ў сваім развіцці. Камуністы заўсёды чэрпалі мудрасць і веды, прыклад і вопыт з велізарнай тэарэтычнай спадчыны Дзімітрава. Яна дапамагае нам лепш зразумець сённяшні дзень, глыбей пранікнуць у будучае.

**Дора ДЗІМІТРАВА,**
**аспірантка кафедры кібернетыкі БДУ імя У. І. Леніна, дэпутат Народнага сходу НРБ.**

● АЛЁ, ІНТЭРНАТ!

# БУДНІ СТУДСАВЕТА

ПА ВЫНІКАХ чарговага агляду-конкурсу інтэрнат № 4 заняў трэцяе месца. Калі ўлічыць, што інтэрнат з'яўляецца адным са старэйшых ва універсітэце, то трэцяе месца пасля сучасна абсталяваных інтэрнатаў № 7 і № 6 ужо гаворыць аб вялікай рабоце, якую праводзіць студсавет.

Вечарам тут збіраецца асноўная маса жыхароў. Хто з заняткаў, а хто з бібліятэкі ці тэатра... Я іменна ў такі час трапіў у чацвёрты інтэрнат, які знаходзіцца на праспекце імя П. М. Машэрава. Тут жывуць студэнты двух факультэтаў: юрыдычнага і хімічнага, а таксама слухачы падрыхтоўчага аддзялення.

Размова са старшынёй студсавета інтэрната Мікалаем Карбалевічам адбылася ў пакоі студсавета. Мой субяседнік даволі падрабязна расказваў аб сваёй рабоце, аб тым, чым жывуць студэнты, як праводзяць свой вольны час.

Сапраўды, многае ўдалося зрабіць студсавету. Яго старшыня, студэнт II курса юрфака Мікалай Карбалевіч, здаецца, і прызначаны для такой пасады. Толькі ў гэтым годзе сіламі студэнтаў абсталяваны ленінскі пакой і пакой адпачынку, абноўлена наглядная агітацыя, рэгулярна стала выходзіць насценная газета «Таварыш». Ініцыятарам ва ўсіх справах з'яўляецца студсавет. Яго камісіі трымаюць пад пільнай увагай і арганізацыю культурна-выхаваўчай работы, і жыллёва-бытавыя ўмовы, і фізкультурна-спартыўную работу.

Гартаю журнал уліку мерапрыемстваў, якія праводзіць студсавет. Тут зафіксаваны цікавыя вечары, прачытаныя лекцыі. У культурна-выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў вельмі дзейсную дапамогу аказваюць студсавету выкладчыкі факультэтаў. Перада мной распараджэнне па дэканату юрыдычнага факультэта ад 12 лістапада 1981 года, дзе гаворыцца аб назначэнні кафедр адказнымі па інтэрнату. Па чарзе кафедры наладжваюць тут своеасаблівае дзяжурства, у час якога праводзяць шэраг цікавых і разнастайных мерапрыемстваў. Такая форма работы ў інтэрнаце, безумоўна, вельмі патрэбная. Дарэчы, выкладчыкі прыходзяць у інтэрнат не толькі каб пачытаць запланаваную лекцыю ці зрабіць праверку. Тут у першую чаргу сустракаюцца аднадумцы, улюбёныя ў сваю прафесію людзі. Аднак у культурна-выхаваўчай камісіі студсавета, якой кіруе ужо трэці год студэнтка IV курса хімфака Ірына Тоўсцік, ёсць і цяжкасці.

— Няма сваёй музычнай радыёапаратуры, — заяўляюць у адзін голас у студсавеце, — таму і атрымліваюцца нецікавымі дыскатэкі.

Як ні шкада, але гэтая «хвароба» ахапіла многія нашы інтэрнаты. Надзея выправіць становішча паявілася пасля таго, як студэнцкі клуб юрфака паабяцаў дапамагчы ў правядзенні дыскатэк. Гэта будзе значная падтрымка, але не рашэнне праблемы. Студсавету неабходна свая радыёапаратура, ды і не толькі для дыскатэк. У інтэрнаце няма радыёвузла.

Безумоўна, значная частка работы студсавета накіравана на паляпшэнне жыллёва-бытавых умоў. Вырашаць гэтыя задачы аднаму студсавету не пад сілу. Тут неабходна актыўная дапамога саміх студэнтаў. Узяць хоць бы санітарны стан пакояў. Табель, які вывешаны на першым паверсе інтэрната, адлюстроўвае агульную карціну. Але гэта толькі фармальны бок. Трэба сказаць, што жыллёва-бытавая камісія студсавета (старшыня Ірына Цішчанка, 3 курс юрфака) не абмяжоўваецца толькі вядзеннем табеля. Санправеркі праводзяцца рэгулярна. Часам — разам з прадстаўнікамі групы народнага кантролю. Адчувальна дапамагае студсавету ў гэтай справе партыйная група, якая існуе ў інтэрнаце.

Прыклад камуністаў з'яўляецца арыенцірам для жыхароў інтэрната. Кожны месяц падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж паверхамі, вызначаюцца лепшыя пакоі. Пераможцамі за апошні месяц, як бачна з аб'явы, сталі пакоі №№ 231, 407, 512 і трэці паверх.

Студсавет, як бачым, многае робіць для паляпшэння ўмоў жыцця і адпачынку. Пакуль што не ўсё ўдаецца. Ёсць праблемы з дзяжурствам на паверхах, недастатковая яшчэ колькасць членаў аператыўнага атрада ў інтэрнаце. У некаторых пакоях не хапае мэблі.

Аднак, як бачна па рабоце студсавета, гэтыя недахопы яму пад сілу выправіць. Прыкладам можа паслужыць і актывізацыя фізкультурна-масавай работы ў інтэрнаце.

Хацелася б яшчэ адзначыць сувязь студсавета з камендантамі інтэрната Валянцінай Пятроўнай Яршовай і Міхаілам Пятровічам Клопавым. Сумесная работа ідзе на карысць усім.

Калі я пакідаў інтэрнат, то ў вестыбюлі ішла ажыўленая размова паміж камендантам і старшынёй студсавета. Абмяркоўвалася пытанне аб стварэнні стэнда аб лепшым пакоі...

**І. ЮЛЬЯНАЎ,**
**наш спец. кар.**



ДА 60-ГОДДЗЯ УТВАРЭННЯ СССР

● ТАДЖЫКСКАЯ ССР: РОЎНАЯ СЯРОД РОЎНЫХ

# Флагман ВНУ Таджыкістана

**Таджыкскі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна — буйнейшая вышэйшая навучальная ўстанова рэспублікі. На яго факультэтах навучаецца каля 14 тысяч студэнтаў 40 нацыянальнасцей.**

**НА ЗДЫМКУ:** ленінскія стыпендыяты (злева направа) — **М. Раджабаў, С. Касымава, Н. Дзенісенка і Б. Хатамаў.**

Фота **Ю. Набатава і Р. Нецелева.**

ДА 60-ГОДДЗЯ

ЎТВАРЭННЯ СССР

# СТУДЭНЦКАЕ СВЯТА Ў ВЯЗЫНЦЫ

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Я. КОЛАСА І Я. КУПАЛЫ

**ВЫДАТНАЯ** традыцыя ёсць на філалагічным факультэце—штогод увесну на Радзіме Янкі Купалы збіраюцца будучыя спецыялісты-філолагі на свой злёт, каб падвесці вынікі работы за год, прадэманстраваць усё тое лепшае, што дасягнута факультэтам, намеціць планы на будучае. Сёлетні—VI па ліку злёт студэнтаў-філолагаў у Вязынцы—асаблівы, ён праходзіць у 60-ю гадавіну ўтварэння СССР і прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

«Утварэнне СССР, устанаўленне адносін дружбы, давер'я, узаемадапамогі паміж народамі надало гіганцкае паскарэнне духоўнаму развіццю грамадства, народжанага Вялікім Кастрычнікам»,—гаворыцца ў пастанове ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

Свята студэнтаў у Вязынцы—гэта свята дасягненняў беларускага народа і моладзі, літаратуры за гады Савецкай улады, калі Беларусь упершыню як роўная сярод роўных заняла «свой пачэсны пасад між народамі». Гэта—урачыстае шэсце моладзі адноўленага краю, купалаўскіх арлянят, якія на святой і багатай, шчодра палітай крывёю дзядоў і бацькоў зямлі дэманструюць сваю шчырую адданасць і вернасць Чырвонаму Сцягу, Сярпу і Молату, таму, што ім на памяць даравала рэвалюцыя. На студэнцкім святе прагучаць песні моладзі, якія сталі іх «асалодай у жыцці прадвесні», песні волі і долі, шчаслівага шляху, прысвечаныя партыі, Радзіме, камсамолу. Студэнты памераюцца сілай, паспаборнічаюць у спрыце, смеласці, цярплівасці і вынослівасці, правядуць спартыўную эстафету, каб сапраўды «кожны быў, як волат». Развучваюцца даўнішнія і больш блізкія народныя гульні, забавы дзяцінства, у якія яшчэ калісьці гулялі дзеці з паэмы Я. Коласа «Новая зямля».

На свяце ў Вязынцы будучыя маладыя спецыялісты-філолагі, якім працаваць у XXI стагоддзі, пакінуць прыгожы напамін аб сабе—пасадзяць дрэўцы, кусты, кветкі, прывядуць у парадак плыткія берагі паглыбленага сёлета азярца на старадаўняй зямлі Купалы. Будучыя інтэлігенты, плоць ад плоці народнай костачкі, дзеці рабочых і сялян, выйдуць на свой працоўны дэсант.

Атмасфера свята студэнтаў—гэта атмасфера купалаўскага верша «Арлянятам», яркая дэманстрацыя таго, як тыя заклікі, звароты, надзеі на моладзь народных песняроў спраўдзіліся ў савецкі час.

Удзельнікі і госці злёту агледзяць выстаўкі выяўленчага і прыкладнога мастацтва, усяго таго, што зроблена рукамі студэнтаў,—вышывак, мярэжак, інкрустацый, чаканак, драўляных і гліняных вырабаў, малюнкаў, а таксама падрыхтаваных насценных газет, спецыяльных святочных выпускаў, паэтычных дадаткаў, зборнікаў, альманахаў. Сапраўдны студэнцкі кірмаш разгорнецца ў гэты дзень ва ўрочышчы Вязынка, дзе вырасце палатачны гарадок, дзе кожная палатка будзе нагадваць святочна прыбраную хату з абрусамі і ручнікамі, з хлебам-соллю пры ўваходзе, саматканымі дыванамі на сценах і на падлозе, з мярэжкавымі фіранкамі на акенцах для каларыту. Як аформіць «хату»—тут, як кажуць, вялікі прастор для творчай фантазіі кожнаму атраду, кожнаму ўдзельніку свята. Галоўнае, захаваць і перадаць іншым дух, атмасферу свята, урачыстасці. Кожны такі конкурс будзе ацэньвацца кампетэнтным журы. Удзельнікі злёту, якія прыедуць у Вязынку, пройдуць каля выстаўкі па творах Я. Купалы і Я. Коласа, разгорнутай самімі студэнтамі, агледзяць выстаўку буклетаў, кніг, сувеніраў да юбілею, пабываюць і на выстаўцы-аглядзе курсавых, дыпломных работ, навуковых даследаванняў на купалаўскую і коласаўскую тэматыку. Адбудзецца віктарына на лепшае веданне твораў класікаў роднай літаратуры, конкурс чытальнікаў.

Будзе панаваць на свяце яе Вялікасць паэзія. Словы народных паэтаў, звернутыя да моладзі, будуць чаргавацца з вершамі членаў літаратурнага аб'яднання «Узлёт».

Сапраўдным святам самадзейнага мастацтва стане канцэрт студэнтаў на летняй эстрадзе, у якім выступяць лепшыя калектывы і выканаўцы факультэта: фальклорныя ансамблі, спевакі, танцоры.

Да ўсіх цікавых спраў на свяце трэба дадаць і конкурс на лепшую нацыянальную страву ў абед, дзе, напэўна ж, можна будзе пакаштаваць і клёцкі з сокам...

Пройдуць на свяце выступленні агітбрыгад. «На шчасце», «на долю» паплывуць па вадзе купальскія вянкі, якія апусцяць на ваду дзяўчаты філфака. Завершыцца злёт кастром дружрагоды студэнты, будуць танцаваць, пець песні, «да вытокаў душой дакрануўшыся...»

Сцяг злёту ўзнімуць ленінскі, купалаўскі, коласаўскі стыпендыяты і лаўрэат стыпендыі імя П. Броўкі. Выступяць ганаровыя госці злёту. Студэнты-філолагі запрашаюць прыняць удзел у свяце пісьменнікаў, лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій імя Я. Купалы і Я. Коласа і просяць іх выступіць з чытаннем твораў.

...Пройдзе яшчэ крыху часу, і вось 15 мая ў Вязынцы на лугавую паляну, дзе збяруцца тысячы студэнтаў, выедуць вазкі, запрэжаныя агнявымі коньмі з бомамі, са стужкамі ў грывах, раздасца голас скрыпкі ў новым узнёслым часе, для новых шчаслівых пакаленняў. Загучыць купалаўская жалейка... Так пачнецца свята студэнтаў-філолагаў у Вязынцы.

Запрашаем на свята!

Ул. НАВУМОВІЧ,
дацэнт,
старшыня аргкамітэта
злёту студэнтаў-філолагаў.

СПОРТ

# ПЕРАМАГЛІ МАЦНЕЙШЫЯ

## ДА ВЫНІКАЎ ПЕРШЫНСТВА УНІВЕРСІТЭТА ПА ФУТБОЛУ

НАБЛІЖАЕЦЦА да фінішу агульнауніверсітэцкая спартакіяда. Адзін з яе цікавейшых і захапляючых турніраў — першынство па футболу — закончыўся на мінулым тыдні. Калі даць агульную ацэнку прайшоўшых спаборніцтваў футбалістаў, то ўпэўнена можна паставіць высокі бал. І ў плане арганізацыі турніру, і ў складанні раскладу гульняў — усё было загадзя прадумана.

У першы дзень першынства сустракаліся мінулагодні чэмпіён універсітэта каманда журфака і каманда ФПМ. Нічыйны лік гульні (0:0) справядліва паказаў суадносіны сіл на полі. Гульня была ўпартай, аднак камандам не ўдалося забіць гол. Дарэчы, і ў далейшым бамбардзіры гэтых каманд не вызначаліся рэзультатыўнасцю.

Камандзе факультэта журналістыкі патрэбна было абараняць высокі тытул чэмпіёна. Але ў гэтым годзе футбалістам журфака такая задача была не пад сілу. У параўнанні з мінулым годам састаў каманды змяніўся напалавіну. Адчувалася няўзгодненасць у дзеяннях футбалістаў на полі. Да таго ж, не заўсёды каманда па розных прычынах магла выставіць свой мацнейшы састаў.

Зусім іншай сёлета аказалася каманда фізічнага факультэта. Усе тыя якасці, якіх не хапала журналістам, былі ў наяўнасці ў футбалістаў фізфака. Гульня паміж камандамі фізфака і журфака закончылася з лікам 2:1. Трэба адзначыць, што гульня была роўнай, аднак вынік 2:1 на карысць фізікаў быў заканамерным. У саставе фізфака шмат нядрэнных футбалістаў: варатар Павел Кліменка, нападаючы Сяргей Аляксандраў, паспяхова гулялі Ігар Блізнюк, Андрэй Глушкоў. Усе гэтыя футбалісты з'яўляюцца членамі зборнай каманды універсітэта.

У такім стылі, як і фізфак, выступала і футбольная каманда юрыдычнага факультэта. Ва ўсіх звеннях каманды былі моцныя футбалісты, на якіх і будавалася ўся гульня. Пасля перамогі ў трэцім туры над камандай журфака з лікам 1:0 (дарэчы, журналісты не забілі пенальці) юрфак атрымаў магчымасць змагацца за чэмпіёнскае званне. І гульня юрфак—фізфак павінна была многае вырашыць. Ва ўсякім разе перамога над фізфакам рабіла б каманду юрфака без 5 хвілін чэмпіёнам.

Атакамі футбалістаў юрфака і пачалася гульня. Умелыя дзеянні Міхаіла Рамаsuccінскага і Васілія Тулякова набліжалі юрфак да гола. Аднак першымі забілі ўсё ж фізікі. А канчатковы вынік — 2:1 на карысць футбалістаў фізфака. У цэлым гульня насіла нервовы характар. Было многа грубасці. Гэта не да твару камандам, якія змагаюцца за першае месца. Падлівала масла ў агонь і няўпэўненае судзейства гульні. Суддзя ў такой адказнай сустрэчы праяўляў нерашучасць.

Даволі баявой камандай выглядалі футбалісты механіка-матэматычнага факультэта. Аднак ім не хапала стабільнасці ў выступленнях. Як паказаў турнір, у камандзе мехмата паявілася некалькі перспектыўных футбалістаў, якія будуць запрошаны ў зборную універсітэта.

А ў футбольнай каманды геафака, наадварот, прагрэсу не адчувалася. Каманда страціла свой стыль гульні, які быў закладзены ў мінулыя гады. Ды і на некаторыя гульні каманда выходзіла без адзінай футбольнай формы. Гэты факт ужо ніяк не ўжываецца з мінулымі поспехамі футбалістаў геафака.

Усе вышэйпералічаныя каманды і прадстаўлялі першую групу першынства БДУ імя У. І. Леніна па футболу. У гульнях паміж сбой каманды змагаліся за 1—6-я месцы. У другую групу ўваходзілі слабейшыя па класу каманды: факультэт радыёфізікі і электронікі, біяфак, гістфак, філфак, хімфак. Тут барацьба была за 7—11-я месцы. Пераможца другой групы і апошняя каманда першай групы ў пераходнай гульні аспрэчваюць права гуляць у наступным годзе ў першай групе.

Паведамляем чытачу канчатковы вынік першынства:

**І група**

**1. Фізфак (180)**
**2. Юрфак (150)**
**3. ФПМ (120)**
**4. Мехмат (90)**
**5. Геафак (80)**
**6. Журфак (70)**

**ІІ група**

**1. Радыёфізікі і электронікі (70)**
**2. Хімфак (60)**
**3. Біяфак (50)**
**4. Гістфак (40)**
**5. Філфак (30)**

**У дужках — колькасць ачкоў, якія пойдуць у залік спартакіяды.**

Як бачым, вышэйшыя месцы ў турнірнай табліцы занялі тыя каманды, якія змаглі паказаць стабільную гульню на працягу ўсяго турніру. Цяперашні чэмпіён — каманда фізфака—заслужана перамог. Трэба дадаць, што ў мінулым годзе ў каманды быў толькі чацвёрты вынік.

На тых жа пазіцыях засталася каманда ФПМ. Трэцяе месца, як і ў мінулым годзе, наўрад ці задаволіла футбалістаў.

Ну, нарэшце, і самы нечаканы вынік першынства: мінулагодні чэмпіён — каманда факультэта журналістыкі — заняла апошняе месца ў сваёй групе. Пераходная гульня з камандай факультэта радыёфізікі і электронікі ў асноўны час не вызначыла пераможцу. У дадатковыя два таймы па 10 мінут радыёфізікам удалося забіць тры мячы. Такім чынам, гэтыя каманды на наступны год памяняюцца месцамі ў групах. Гэтая апошняя гульня турніру паказала і адмоўныя з'явы. Аб прынцыповасці гульні гаварыць не даводзіцца. І журналістам, і радыёфізікам патрэбна была толькі перамога. Аднак па-рознаму каманды імкнуліся да яе. Футбалісты радыёфізічнага факультэта паказвалі грубую гульню, нетактоўна і зняважліва адносіліся да сваіх супернікаў.

Адразу пасля заканчэння першынства я сустрэўся з галоўным суддзёй Віталіем Данілавічам **Ліштванам**. Вось невялікая вытрымка з яго расказа:

**— Хочацца адзначыць, што розыгрыш чэмпіёнскага тытула па дзвюх групах цалкам сябе апраўдвае. Як у першай, так і ў другой групах ішла напружаная барацьба. У гэтай сувязі патрэбна сказаць, што цяперашні «сярэбраны» прызёр першынства ў мінулым годзе выступаў у другой групе. Ёсць у нас нараканні да каманд. Пакуль не ва ўсіх ёсць адзіная спартыўная форма. Быў адзін выпадак няяўкі каманды філфака на гульню. Трэба падцягнуцца і з дысцыплінай на полі.**

**І такое пажаданне да ўсіх студэнтаў, якія захапляюцца футболам: магчымасці універсітэцкага стадыёна дазваляюць вам павышаць сваё майстэрства, так што не губляйце дарэмна час. Наперадзе вас чакаюць новыя футбольныя паядынкі.**

І. ПАПКО,
наш спец. кар.



ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

# КРАСАВІЦКАЯ ЭСТАФЕТА

**ПРАЙШЛА** традыцыйная лёгкаатлетычная эстафета, прысвечаная дню нараджэння У. І. Леніна. З ініцыятывай правядзення гэтай эстафеты чвэрць стагоддзя назад выступіў наш універсітэт. З тае пары яна праводзіцца штогод. Але калі траса першых спаборніцтваў складала не больш чым 3 км, то цяпер яна павялічылася да 11 км 200 м. Змяніўся і колькасны састаў удзельнікаў: у гэтым годзе на вуліцы горада выйшла 1200 спартсменаў. Сярод іх і школьнікі, і навучэнцы ПТВ і тэхнікумаў, рабочыя і студэнты.

Нашы асноўныя супернікі, лёгкаатлеты інстытута фізічнай культуры і інстытута народнай гаспадаркі, былі ў цудоўнай спартыўнай форме.

У 11.00 спаборніцтвы пачаліся. На старце Ірына Данільчанка. Яна вучыцца на І курсе юрфака, кандыдат у зборную Беларусі. Безумоўна, яна не магла не апраўдаць надзеі трэнераў. Паспяхова пераадолелі свае дыстанцыі таксама Сяргей Бандарчук, чацвёртакурснік мехмата, Алена Чурак, выкладчыца кафедры фізвыхавання і спорту, Юрый Шымкевіч, студэнт фізфака. Дарэчы, Юрый прыняў эстафету чацвёртым, перадаў трэцім, чым, канешне, вельмі дапамог камандзе.

— Але намаганняў аднаго чалавека для перамогі ў эстафеце недастаткова,—каменціруе ход спаборніцтваў выкладчыца кафедры і непасрэдная ўдзельніца спаборніцтваў Таццяна Касцюшына.

Яна адзначае таксама, што найбольшую колькасць удзельнікаў эстафеты прадставіў юрфак. Сярод іх Алег Гайдучонак, Валянціна Першына, Канстанцін Курачкін. У заваяванні прызавога трэцяга месца камандай нашага універсітэта ёсць уклад і гэтых рабят. Толькі 12 секунд аддзяляюць нашых спартсменаў ад студэнтаў з БДІНГ, якія занялі 2 месца. А ў мінулым годзе разрыў склаў цэлую мінуту. Гэта ўсяляе надзею, што ў будучым годзе, на наступнай красавіцкай эстафеце, наша каманда пастараецца прыйсці да фінішу першай.

І. АРОНАВА,
І. ЖВАЛЕЎСКАЯ,
студэнткі журфака.

СПОРТ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

13 мая 1982 г.

АТ 21271 Заказ 959

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ